**Галіна Каржанеўская**

# Вершаняты

*мініяцюры*

Мінск, 2005

УДК 882.6-1
БЕК 84 (4 Беи)
К 21

Каржанеуская Г.

Вершаняты.Паэтычныя мініяцюры/ Г.Каржанеўская.- Мн.: «Беллітфонд», 2005.- 120 с.

ISBN 985-6576-57-1

Роздум пра жыццё і свет, пра сябе ў гэтым свеце, пра глыбіні і складанасці чалавечай душы, пра няпросты шлях да ўдасканалення - вось што складае змест новай кнігі вершаў вядомай паэткі.

УДК 882.6- 1
ББК 84 (4 Беи)

ISBП 985-6576-57-1

© Корженевская Г., 2005
© Оформление
«Беллитфонд», 2005

*

Думала, што выбрала
ўсе запасы,
Што з паэтаў выбыла
я дачасна.

Цуды шчэ здараюцца,
Шлюзы адчыняюцца,
І крылаты з неба госць
Падзівіўся:
голас ёсць!

«Гыля, гыля, вершаняты,
вершаняты-птушаняты!»
Ніл Гілевіч

# 1

*

Мы ўсё зразумеем -
                    хто сёння, хто потым,
Такую мажлівасць нам доля дала.
Не кожная завязь
                    становіцца плодам,
Ды плод пажаданы -
                    бо квецень была.

*

Дзе лета залатыя міражы?
Яны дасюль нам
                    мірсцяцца і сняцца.
І так бывае холадна душы,
Што першых ручаін
                    не дачакацца.

## ДОБРА

Добра прайсціся па голым лесе,
Дзе праз іглiцу
                    пралеска лезе,
Дзе паказацца вось-вось гатова
Лісце бліскучае -
                              дрэваў абнова.
Добра у заўтрашнім
                    думкай блукаць.
Добра сябе хараству
                    адкрываць.

*

Мне пра яго напамінае
Усё, што міла выглядае:
І чысты снег, і ліст зялёны,
І зорак дзіўныя пісьмёны...

Даўно інакшымі мы сталі,
Бо іх сумесна прачыталі.

*

Выпала так, як выпала,
Яблыня цветам абсыпала.
Думаю, будуць плады.
Рынуцца гідкія вусені,
Абараняць сябе мусім мы
Свой ураджай залаты.

*

Сказаў матылёчак гожы,
Што сеў адпачыць на крыжы:
Свет не такі і варожы,
Свет не такі і чужы...

*

Сонца аднолькава любіць усіх:
Грэшных і праведных,
добрых і злых.
Сонца дзяліць на гатункі не ўмее
Гада, казюрку яно абагрэе.
Звера узросціць і дасць яму сілу.
Сэрца вялікае
мае свяціла...

## ПЫТАННІ

Хто чуе тэлефонны зык,
Калі няма нас дома?
Дзе днююць сны начныя
І дзе начуе стома?
Куды плыве асенні ліст
І лёд вясновы?
Навошта коласу асцё,
Пачуццям - словы?

**ВІНА**

Пракачаўшыся ноч без сну,
Зразумееш,
у чым вінавата.
Напісала б я верш пра віну,
Ды віна і натхненню не рада.

*

Ён агаломшыць, ён настане -
Суровы час падсумавання.

Як след узважыць, раскладзе
Калі, чаму, нашто і дзе.

Усе куточкі асвятліць,
І зразумееш: нечым крыць...

## ПАТРЭБНА «ДОСЯ»

Быць каўняром -
ці ж гонар для лісіцы
Чаму скарацца
і каму служыць?
Гардыня ганьбы, як агню, баіцца,
Сумненняў шмат
у слабае душы.

І каб яе ачысціць, падалося -
Патрэбна «Дося»!

*

Не будзем думаць пра благое,
А пра харошае -
такое,
Што падмацуе, дапаможа
Далей ісці па бездарожжы;
Што будзе светачам і сцягам
Насуперак
будзённым звягам;
Што змрок душэўны разганяе,
Што нас —
над намі узнімае.

*

Не ўсё ў жыцці
і радасна, і гладка
Спакусы,
перашкоды,
міражы...
Але гарыць нябесная лампадка
Ў жывой неабыякавай душы.

## З ДАРОГІ

Пашанцавала:
ў свеце пабывала,
Дзе дух ракою горнаю бруіцца.
Каб стаць свабоднай,
гэтага замала.
Затое дастаткова,
каб змяніцца.

*

Сады абсыпаны.
                                        За дар
Плаціць хоць чым усе павінны.
Змірае яблыню цяжар
Ды выпрабоўвае галіны.

Так нас, жанчын,
                              змірае шлюб -
Што сёння, што «во время оно».
Усё жыццё памешваць суп -
Зусім не царская карона...

*

Ўсё з Божай волі
                              і Божай ласкі:
На полі - колас,
                              на лузе - краскі.
Сняжок цярушыць
                              альбо імжыць —
Цяпельца знойдзеш -
                              і можна жыць.
А як шчэ сонца прыгрэе -
                                        знай,
Што гэта маем
                              зямны наш рай,

*

Церусіўся сняжок
ды на сонцы іграў.
Цешыў рой залаты,
быў я леем на сэрца.
Нехта іншы з мяне
гэты рой назіраў -
Той, хто вечна жыве
і з нягодаў смяецца.

## ДАБРАВЕСЦЕ

Меў выгляд маланкі, калі гаварыў:
«Не шукайце між мёртвых Жывога!»
Гэтай весткай сваёю
людзей акрыліў
І наблізіў іх сэрцы да Бога.

*

Не сонца відно мне -
адбітак з чужога акна.
Не волю знайшла я,
а толькі самоты вязніцу
І скардзіцца некаму,
(бо, паміж намі, дурніца).
І стала жыццё чорна-белым,
і мроям - хана.

*

Зацьменне месяца.
Абручык залаты
І той пагас, растаў на небасхіле.
Запанавала цемра.
Цемра ў сіле
Адно часова, міг — не на гады…

*

Хто маці сцураўся,
Каму не баліць,
Хто ў норцы сваёй, халадзеючы,
спіць,
Хто жыцце марнуе
І ў спрэчцы з сабой -
Той будзе разбуджаны
суднай трубой.
І дзесь угары,
азіраючы свет,
Архангел рыхтуе, відаць,
інструмент.

*

Мяне твая падтрымка акрыліла,
Нябесны воін наш, Архістраціг.
Я гэты свет нядаўна палюбіла
І ворагаў сваіх (так, нават іх!).

Інакшае рэальнасці праявы
Ва ўсім, паўсюль, вакол -
дзе ні ступі.
] гэта не для гонару падстава,
А толькі папярэджанне:
не спі!

## КАЛІ...

Калі мы не можам
пазбыцца віны?
Калі адчуваем:,
што мы не адны?
Калі - над грудочкам -
высочвае нас
Няўмольны
і ўсё-ткі паблажлівы Час?
Калі у наступнае
ладзім масты?
На Радаўніцу і на. Дзяды,

*

Разважала рака:
- Горш няма тупіка,
Неахвота
Зрабіцца балотам.
А балота з імхоў
У адказ:
- О-хо-хо...
Мне так добра...
Пра сумнае — потым.

## НАШТО?

Мільгаюць лета і зіма,
Плятуць карункавыя звенні.
Не разумею я сама,
Нашто іх дзіўнае кружэнне.

Наш то бяда, нашто любоў,
Нашто нявер'е без прасвету
Ў сябе дапытваюся зноў:
Нашто юдоль зямная гэта?

*

Любоў ліслівай не бывае.
Яна слугуе і трывае.
Падчас суроваю бывае,
Калі бязладдзе выкрывае.

Любоў ліслівай не бывае...

*

У Бога многа не прасіце.
Яму а д т у л ь і так відно,
Чаго мы варты,
выш ці дно
Нам забяспечаны ў нябыце.

*

Калі са дна
паднімецца ўся муць,
Тады і «Ойча наш» не дапаможа...
Чаму ты аддаляешся так, Божа?
А без Цябе і мухі дапякуць.

*

Грыміць пустая электрычка,
Ажно за тры вярсты чуваць.
Ў пустога
ёсць такая звычка:
Здалёку галас паднімаць.

*

Эквадорскі банан,
Італьянскае ківі...
З беларускага -
Бульба, капуста
ды «Крыві»...

*

Рыпяць прыступкі пры хадзьбе,
А шлях
губляецца у змроку.
Калі ж прыйду я да сябе?
Чым далей,
тым пакутней крокі.

2

*

Верабейка шэры -
Скок - скок - скок,
І ў мароз, і ў спёку бесклапотны.
Колькі ў птушкі цела?
Камячок!
А хапае ж сілы для палёту!

## ДЫМ

Семак просяць галубы,
Змерзлі верабейкі.
Павярнула дым: з трубы -
Ён бухматы нейкі.

У дыма логіка свая:
«Куды вецер - туды й я».

*

Ці сонца, ці печка, ці батарэя,
Ці зыркае вогнішча каля ракі -
Люблю іх бясконца!
І ўсё, што не грэе,
Здаецца, па шчырасці,
лішнім такім...

*

Лепей не валодаць,
чым згубіць,
Лепей адысці,
чым заняволіць.
Лепей прыхапіць чужога болю,
Чым с я свой на некага
ўзваліць.

*

Надакучыла быць слабою,
Надакучыла быць
з табою.
І колькі б нясмеласць ні мучала,
Саступаць усім
надакучыла!

*

Здагадкі ніяк не адрыну:
Як чэпка мы ўмеем любіць!
Матуля,
сваботу дай сыну,
Каб здолеў свой шлях
пратарыць.

*

Інакшай стану,

але ж не забуду,

Як цяжка мне даваўся

кожны крок…

Адно тады парушацца запруды,

Як зробіцца нястрымным

волі ток.

*

Паводка сніцца.

Ў роспачы стаю:

Ўсё заліло,

хістаецца масток.

А хлопчык нейкі

(ўнучак ці сынок?)

Упарта не бярэ руку маю...

## ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

У атачэнні пошасці жыла,
Здавалася: усе навокал шпікі.
Хапала ёй і ў цемрыве святла,
Бо абразоў вакол свяцілі лікі...

## УЛАДЗІМІРУ КАРАТКЕВІЧУ

Ягоных кніг баяўся сон,
За ноч прачытваліся, мусіць.
Ен адкрываў нам
Беларусі
Душу -
пяшчотную, як лён.

## ЯЗЭПУ ДРАЗДОВІЧУ

Дзяўчаткам
па руцэ гадаў,
Быў дзіваком ён і паэтам.
І нейкі час
у снах лятаў
На неадкрытыя планеты.

*

Добрай парой
нарадзіўся Купала:
Сонца высока,
свяціць не прыстала.
Траўка не зжухла
і кветка не звяла.
Працы хапае
і святаў нямала.

*

Такую пару не збярэ і Мун.
Пражытаму
цяпер не скажаш "Кыш!"
Я білася, як хваля аб валун,
А ты усё такі ж,
усё такі ж...

## МІКОЛЫ

Мяне ўсё жыццё
акружалі Міколы.
Хапала прыгодаў.
Хай Бог цяпер судзіць.
"Мікола" на сёння гучыць,
як "ніколі".
Ні Колі, ні Галі -
інакшыя людзі

*

На спіну перавярнуўся жук,
Ножкамі сучыць бездапаможна.
Незнарок наступіць падарожны
І ў жука ні тузання, ні мук.

*

У маразы вялікага сабаку
У лесе прывязалі да сасны,
Пакінулі...
                    То гыркаў ён, то плакаў...
Да нелюдзяў
                    няўжо не прыйдзе ў сны?

*

Вы пакарміце качак ці варон,
Калі мароз прыцісне - забіяка.
І можа стацца:
                да вясновых дзён
Вас будзе грэць
                птушыная падзяка.

*

Мяне ляпілі
                быццам з пластыліну,
Іскрынку раздзімалі у душы,
Мятлою адганялі міражы -
І я руку, удзячная, не кіну.

*

Я сваe абалонкі зрывала,
Пабывала ў аркане Таро.
Ды азёрнае чайкі пяро
Сувенірам
дадому забрала.

*

Калі было аднойчы горка,
Дастала руну (дагары),
І вось аракула дары:
"Адказы прыйдуць не знадворку
Яны паднімуцца знутры".

*

Ні разу гэтак на мяне
Начная зорка не глядзела.
Ва упор глядзела, не мігцела,
Выразна бачная ў акне.

Яна нахабнаю была,
Пакуль за штору не зайшла.

*

Растала,
размытаю стала дарога,
Туман паглынае,
куды б ні ішоў.
"Ідзе да-па-мо-га,
Ідзе да-па-мо-га" —
Выстукваюць кроплі аб дол
з ледзяшоў.

*

Калі змірыцца - рукі апусціць,
То не хачу я
веруючай быць.

*

Служыце Богу жыццём сваім,
Служэнне блізкім
зрабіце мэтай.
Кал і ж мы проста
ў царкве стаім
І "адбываем" — дарэмна гэта...

*

Каб ведаць,
што ў нас у галовах,
Як едзем у аўтобусе дамоў.
Нас гэты дзень, як млын, перамалоў
Вялікіх і малых,
старых і "новых".

**ГНЕЎ**

У яго даўгія кіпцюры,
У яго раз'ятраныя вочы.
Ен спустошыць
нашы сэрцы хоча
Каб былі як порхаўкі знутры.

## СТРАХ

Маленечкі і шэры, можа ён
Разбухнуць,
    разрасціся невымерна,
Азмрочыць розум,
        акашмарыць сон...
"Звычайны страх" —
      вось вам яго найменне.

## СТРАСЦЬ

"О ненавідная,
      прыйдзі і адпусці",—
Сказаў гіаэт,
      бо паражыў нашэсце
Няволі той,
      што блізкая да смерці
І самая шалёная ў жыцці.

## СЛАВА

Вяртлявая, наіўная нахаба.
На сцэну лезе, ў прэсу, на экран.
Ёй вельмі падыходзіць
                                        рыфма "баба",
Бо дзе яна - там слёзы і падман.

## УЛАДА

Яна заўжды з законам не ў ладах,
Бо і сама жадае быць законам.
Заканчвае жыццё
                                        публічным скопам,
А то і горай -
                                        з куляй у грудзях.

## ЯЗЫКАТЫЯ

Задоўгія у цётак языкі,
А з-пад губы
выглядваюць клычкі,

*

Я закрыла сваё сэрца
на замок,
Каб ніхто таптацца ў ім
не змог.

*

Жыве дзіця ў маёй душы,
Яно плаксівае з пялёнак.
Як свой пакрыўдзіць
ці чужы —
Ажно заходзіцца дзіцёнак.
І трэба ж. так:
няма каму
Суцешыць гэта дзіцянятка,
І носік выцерці яму,
І буську даць у вачанятка,

## БЕЛАЯ ВАРОНА

У белай вароны
Няма абароны:
Вакол віраванне,
Спакою не мае.
Хоць іншае масці,
Ды ўсё-ткі - варона,
А гэты дыягназ
Жыццё не знімае.

## ВЕРУ

Я веру (ў меру),
што жыццё не мука,
А проста эфектыўная навука.

*

Калі пляткарыце і судзіце,
Калі свярбіць
у роце джала,
Вы дакараць (прадбачу) будзеце
Сваю душу —
што дазваляла…

*

У гэтай восені бясконцай
Ёсць безумоўныя плюсы:
Не мерзнуць ногі і насы,
Ды хоць бы кволы
промнік сонца!

Няхай з марозам і са сцюжай,
Ды каб евяціла, каб было,
Каб паднімала на крыло
Чародкі мар маіх нядужых.

3

*

Ну вось і перавал.
У Новы год
Уехалі мы з Божай дапамогай
Пустой мітрэнгі, можа,
і замнога.
Учынкаў мала, смеху і прыгод.

*

Сонца заходзіць
Вядома ж, не так, як усходзіць.
Вопыт нас па жыцці
За руку асцярожненька водзіць.
Ды спатыкаемся,
Носам ляцім на на дарогу.
Ну не бывае страхоўкі надзейнай,
Ей-богу!

*

Недзе, мабыць, я марудзіла,
Ну а дзесьці паспяшала.
Мае шчасцейка як пудзіла
Ад яго карысці мала.
Вараннё, заўжды галоднае,
Папаслося, палятала...
Я сабе да болю родная,
Бо сябе пераўзмагала.

*

Яшчэ адну зіму пражылі,
Яшчэ адзін "наезд"
                    ператрывалі.
Нанізваюцца хвілі,
                    як каралі,
І важнічаюць дні,
                    як каралі.

*

У твар - вясновы вецер-свежачок.
Упэўнены і пругкі зараз
крок.

Ды нечая сагнутая спіна
Падказвае:
яшчэ жыве мана,

Яшчэ хапае
крыўдаў і згрызот...
Чым болей сонца,
тым слязлівей лёд.

*

З нас кожны
Уласнымі путамі скуты.
Размыкаюцца звёны,
Рассыпаюцца путы,
Выпрамляецца
Зморай сагнуты хрыбет...
А насустрач
Зычліва ўсміхаецца свет.

*

Мы цёплыя, пакуль жывём,
Працуе сэрца, як умее.
І перспектыва "вечным сном"
Заснуць —
                    нікога з нас не грэе...

*

Калі вайну паказваюць па тэле,
Тады яна падобна на кіно,
Асколкі - у жывым,
                              у цёплым целе,
Ў акцёры не збіралася яно...

*

Калі як хмарай накрывае,
Ноч бяссонная, даўгая
І за твой настрой чарней -
Мы тады у іншым свеце
І парваць не здольны сеці,
І няма такіх дзвярэй,
Дзе б выразна, адмыслова
Напісалі "ВЫХАД" слова.

**БЫВАЕ**

Бывае, усё ж збываюцца
Нашы надзеі.
Бывае, што слёзна каюцца
Нават зладзеі.

Гляджу на абраз штораніцы,
Пра ўдачу мару.
Я знаю:
ўгары складаюцца
Усе сцэнары,

*

Я ўсю зіму хадзіла па алеі,
Дзе цудам
захавалася гняздзечка.
Развеснілася - вочы падняла:
Вісіць на ліпе,
мокрае, пустое...

*

Горад, няўжо табе лісце няміла?
Зноў на бульварах
шчыруюць пілы.
Велікамучаніца таполя
Нема крычыць ад болю.

*

Сярод цюльпанаў і нарцысаў
Жыве вясна.
Яе капрызы
Вядомы ўсім, бо халады
Наробяць у садах бяды,

Але за ўменне акрыляць
Мы ўсё ёй можам дараваць.

*

Шчасце —
Даволі забаўная штука.
Шчасце - не голад,
Шчасце - не мука.
Шчасце -
Сагрэцца на ручках у мамы.
Сесці у транспарце -
Шчасце таксама.

*

Гэта так многа значыць -
Хто што у іншых бачыць.
Усе навакол з рагамі,
А з крылцамі, бач, мы самі...

*

Яшчэ адна ілюзія растала,
Рассыпалася ў пыл і перастала
Ялейныя карцінкі маляваць.
Зваротным бокам
месяц павярнуўся,
Начных пачвараў
надта не баюся,
Ды іх прыроду пажадана знаць.

## ДУША

Паслухайце,
душа мая - загадка.
Сама сябе імкнуся зразумець.
Чаму я быць хачу,
а нехта — мець?
Чаму любошчы - мёд,
а часам гадка?

Пылінка? Так.
Адначасова - свет.
І нават больш:
пасланніца планет.

*

Жыццё заўсёды паласатае -
Ці ты пачвара, ці святы.
То бласлаўлёныя, то клятыя
Імчацца дні.
Спытай - куды?

Спытай,
які сюрпрыз наперадзе,
Які бар'ер, які віраж.
У звыклым: клопаце і верадзе
Ідзе штодзённы подзвіг наш.

*

Як добра,
          што сёння мне дрэнна,
Бо заўтра пайду на уздым.
Законам суцешуся тым
Ды згадкай:
          усё недарэмна...

**РЫЗЫКА**

Кожнага можа накрыць
Крыўда ці скруха.
Так, гэта рызыка - жыць,
З сіл выбівацца і плыць,
Рваць павуцінне, як муха.

*

Ці маятнік - жыццё,
ці то арэлі -
Разгойдвае, кідае з боку ў бок.
Мне крайнасці давесці захацелі,
Што з цяжкасцю даецца
кожны крок.

Прагрэс не спіць -
ні ноччу і ні днём
Падгоніць, калі трэба, бізуном.

*

Чорнай хмары мяне не дагнаць,
Што напорыста сунецца,
грозна.
Накрывала не раз
невыносна,
Ды цяпер, выбачаюся, позна.
Хмара чорная, хопіць пужаць!

*

Пары асенняй благадаць.
Душа - як ветразік напяты...
Калі нам сонца не відаць,
Мы самі ў гэтым вінаваты.

*

Певень басам закрычаў,
Энергічна дзень пачаў,
Сон прагнаў далёка.

Столькі планаў,
столькі спраў!
Той герой, хто рана ўстаў -
Ўстаў і загалёкаў!

*

Ад радні ад'язджаю,
са слуцкага краю,
І якаясьці стрэмка
мне сэрца скрабе:
- Штосьці я забываю,
штосьці я пакідаю...
Пакідаю, напэўна,
часцінку сябе.

*

Матылі аранжавыя ў крапкі,
Конікі нязмоўчна славяць лета.
А ў буслоў тут, мусі быць,
дыета,
Бо ніводнай
не сустрэла жабкі.

*

Падобных дзён няма,
                    падобных тыдняў.
Не засумуеш на табе, Зямля.
І новых сябрукоў,
                    і новых злыдняў
Прыносіць лёс,
                    каб аддаліць пасля.

*

Сказалі руны:
                    трэба пацярпець,
Пустая ж напалохала сур'ёзна,
Яна маўчала стрымана і грозна
Ды прадвяшчала... новае жыццё.

*

Перастанем сябе шкадаваць.
Мы не знаем,
дзе кат, дзе ахвяра,
Што нясе навальнічная хмара -
Ці яна будзе градам дзяўбаць,
Ці вясёлкай
усцешыць абшары.

*

Мне раўнавагі лёс недададаў
(Можа, зашкальванне любіць Муза
Ды стала спакойнаю, як удаў.
Не хапае хіба што труса.

*

Ўсе хочуць браць
Цяпло і клопат,
Бо на любоў
Вялікі попыт.
І толькі даць —
З праблем праблема.
Няма чаго
Ці скнары ўсе мы?

*

Енчыць дзесьці
нічыйная кошка,
І бяздомны сабака — бядак,
Бо нічыйнасць -
нялёгкая ношка,
Не даецца яна проста так…

*

Як рэзка можа ўсё змяніцца,
Як легка выкіне з сядла!
Трымала Божая дзясніца
Пакуль магла,
пакуль магла...

*

Шапне анёл зажураны: "Пара.
Не бойся, бо наперадзе -
свабода".
Я нават не заўважу пераходу,
І толькі з сэрца зваліцца гара.

*

Няма куды спяшаць,
Няма ахвоты гнацца,
Ды ёсць нам што губляць
І ёсць чаго баяцца.

**МОЎЧКІ**

Сілы поўная да краёчкаў
Ўрэшце выбралася з нары
Ды нясу сябе ў людзі моўчкі
Каб не траціцца без пары.

*

Бывае Бог нам як чужы
І цэлы свет - дурдом.
Адно аўто у гаражы,
Другое - пад дажджом.

*

Разбудзіў бульдозер
на світанку,
І думка ў галаве:
хаця б не танкі...

*

Давай жа будзем радзіцца
З уласным "Я" часцей.
Тады усё наладзіцца,
І вораг твой абгадзіцца,
І стане дзень чысцей.

*

Не закрывай ты сэрца на замок,
Не стой на месцы,
быццам прыкаваны.
Бывае так:
адзін маленькі крок -
І ты ад небяспекі ўратаваны...

*

Пакуль яшчэ мроі і планы раяцца,
Я буду круціцца,
я жыць не прыстала.
"Мне трэба прабіцца,
мне трэба прарвацца",-
Як колісь
адна дзеўчынёшка пісала...

*

З высокага месца
прыемна зірнуць
На нашы абсягі
і нашу старонку,
На гэтую поўную сэнсу скарбонку...
Дык будзь бласлаўлёнай.
Прашу цябе: будзь!

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год